УДК 808.26–313.1 (043.3)

**В. В. Шур (Мазыр, Беларусь)**

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ АНАМАСТЫКА НА ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя аспекты вывучэння паэтонімаў у творах беларускай мастацкай літаратуры, вызначаюцца дасягненні і праблемы ў даследаванні онімаў.*

Гэты артыкул – працяг нашых абагульненняў пра беларускую літаратурную анамастыку, у якім зроблена спроба прасачыць і сістэматызаваць усё напісанае ў айчынным мовазнаўстве ў галіне вывучэння паэтонімаў у творах фальклору і творах беларускіх пісьменнікаў [1].

Пачатак XXI стагоддзя характарызуецца ў беларускай лінгвістыцы прыкметным ажыўленнем цікавасці да праблем анамастыкі, інтэнсіўна пачала развівацца літаратурная анамастыка – параўнальна новы напрамак мовазнаўства, аб’ектам якой з’яўляюцца самыя розныя асаблівасці выкарыстання онімаў у літаратурных творах і фальклоры. Агульныя дасягненні і перспектывы беларускай анамастыкі раней разглядаліся ў працах М. Бірылы, В. Лемцюговай, Г. Мезенкі. (гл. , напрыклад, Весці НАН Беларусі: Сер. гум. навук. – Мінск, 2000, № 1).

Да пачатку XXI стагоддзя ў беларусістыцы літаратурная анамастыка разглядалася як частка традыцыйна-апісальнай лінгвістыкі, нягледзячы на значнае назапашванне разнастайнага тэарэтыка-эмпірычнага матэрыялу, які зусім нядаўна пачаў паслядоўна і сістэмна асэнсоўвацца і кваліфікавацца як важнейшы тэкстаўтваральны і моўна-стылістычны кампанент любога мастацкага тэксту. І калі ў канцы XX стагоддзя даследчыкі анамастычнай лексікі, падводзячы вынікі зробленага ў вывучэнні анамастыкону твораў мастацкай літаратуры, сцвярджалі, што гэты аспект (анамастыкон мастацкіх твораў) закрануты і вывучаны фрагментарна, знайшоўшы адлюстраванне толькі ў асобных тэзісах дакладаў і невялікіх нататках літаратурных крытыкаў, пісьменнікаў (гл. публікацыі Р. Шкрабы, У. Юрэвіча, Дз. Бугаёва, А. Марціновіча, пісьменнікаў К. Чорнага, Я. Скрыгана, Б. Сачанкі і інш.), то ў наш час, без перабольшвання, можна гаварыць пра асобны, новы навуковы напрамак у беларускім мовазнаўстве ў даследаванні літаратурнага анамастыкону, аспекты якога прааналізаваны не толькі ў артыкулах, а і ў манаграфіях, падручніках А. Рогалева [2], В. Ляшчынскай [3], В. Рагаўцова [4], І. Ратнікавай [5], А. Гіруцкага [6], Г. Мезенкі [7. ], Ю. Гурскай [8], В. Шура [9]. Так, А. Рогалеў у грунтоўнай працы «Имя и образ: художественная функция имён собственных в литературных произведениях и сказках» (Гомель, 2007) падрабязна тлумачыць ролю і функцыю імёнаў у творах літаратуры. Ён разглядае агульныя пытанні паэтычнай анамастыкі, напрамкі анамастычных даследаванняў, дае вызначэнне анамастычнай прасторы мастацкіх тэкстаў, тлумачыць значымасць паэтонімаў як неад’емных кампанентаў вобразнай сістэмы твораў, шырока разглядае асаблівасці гаваркіх онімаў, класіфікуе тыпы імёнаў літаратурных і фальклорных персанажаў, вызначае прыроду імён-пераклічак, парадыйных антрапонімаў, імён з падтэкстам, імёнаў-алюзій, імёнаў-сімвалаў і інш. Сёння патрэбна таксама гаварыць пра значную колькасна групу маладых даследчыкаў, якія актыўна працуюць на ніве беларускай анамастыкі, у іх ліку С. Бут-Гусаім (Брэст), І. Гапоненка (Мінск), В. Струкаў, Г. Юдзянкова, І. Каленік (Мазыр), А. Парамонава, І. Зуева, А. Дзеравяга (Віцебск), З. Шведава (Гомель) і інш.

Навуковая аснова беларускай літаратурнай анамастыкі грунтуецца на дасягненнях тэарэтычнай анамастыкі (працы А. Супяранскай, В. Бандалетава, Н.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Падольскай, В. Ніканава і інш.), этналінгвістыкі (працы М. Талстога, С. Талстой, В. Тапарова, І. Карабулатава, Е. Беразовіч і інш.), лінгвакультуралогіі (працы А. Храменка, С. Варкачова, В. Вараб'ёва і інш.), псіхалінгвістыкі працы Ю. Караулава, Д. Гудкова, А. Сядых і інш.), паэтычнай анамастыкі (В. Фанякова, Э. Магазаніка, В. Калінкіна, Ю Карпенка, Г. Кавалёва, В. Супруна, А. Рогалева, І. Ратнікавай і інш.) Яшчэ раней некаторыя прыватныя аспекты беларускай літаратурнай анамастыкі разглядаліся ў артыкулах Г. Басавай, Т. Бугай, В. Грынёвай, Л. Кузьміча, Н. Чабатар, Г. Усціновіч, Н. Лобань, Г. Цыхуна, А. Станкевіч, З. Драздовай, А. Каўруса, В. Краснея і інш. Такім чынам, адметнасці развіцця беларускай літаратурнай анамастыкі за апошні перыяд знайшлі сваё адлюстраванне не толькі ў колькасці публікацый па розных яе аспектах, а і ў выяўленні новых аб'ектаў даследавання, сведчаннем таму тэарэтычныя і апісальныя работы, прысвечаныя анамастыкону твораў В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы, А. Мрыя, І. Мележа, Я. Брыля, Ф. Янкоўскага, І. Навуменкі, У. Верамейчыка і іншых пісьменнікаў, што апублікаваны ў апошні час у матэрыялах міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый, праведзеных у Віцебску, Гомелі, Мазыры, Мінску, Брэсце.

За апошнія гады апублікаваны і атрымалі станоўчыя характарыстыкі вучэбныя дапаможнікі, у якіх знайшлі належнае апісанне і класіфікацыя разнастайныя падсістэмы асобных уласных імёнаў, прозвішчаў, мянушак, псеўданімаў, айконімаў, гідронімаў, мікратапонімаў, урбанонімаў, віконімаў, адтапанімічных вытворных, а таксама разнастайных паэтонімаў, што ўжываюцца ў творах беларускай, рускай мастацкай літаратуры. Гэта дапаможнікі, аўтарамі якіх з'яўляюцца дактары філалагічных навук А. Ф. Рогалеў[2], Г. М. Мезенка[7], В. В. Шур [9], а таксама калектыўныя дапаможнікі «Беларуская антрапанімія» (Віцебск, 2009) і «Белорусская ономастика: топонимия» (Минск, 2012), падрыхтаваныя пад рэдакцыяй прафесара Г. М. Мезенкі, у якіх у асобных частках праведзена апісанне сутнасці тэкставых онімаў у творах мастацкай літаратуры, прыводзяцца тэарэтычныя звесткі аб сучасным стане вывучэння онімаў у творах беларускіх і рускіх пісьменнікаў, даюцца трэніровачныя матэрыялы для самастойнай працы студэнтаў, накіраваныя на авалодванне і замацаванне тэарэтычнага матэрыялу.

У 2010 г. у Інстытуце мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа НАН Беларусі была праведзена Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць", дзе засведчана, што ў Беларусі аднаўляюцца традыцыі шырокага навуковага вывучэння і абмеркавання праблем беларускай анамастыкі, паколькі апошняя такая канферэнцыя «Праблемы беларускай тапаніміі» адбылася ў Інстытуце мовазнаўства ў 1967 г.

На пленарным пасяджэнні (20 красавіка 2010 г.) былі абмеркаваны шматпраблемныя даклады, у якіх падводзіліся вынікі зробленага (канец XX – пачатак XXI ст.) у вывучэнні анамастыкі, вызначаліся задачы і перспектывы ў галіне стандартызацыі назваў геаграфічных аб'ектаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з усталяванымі міжнароднымі нормамі (даклады Г. М. Мезенка, В. П. Лемцюговай, Н. Р. Аўраменка), асобна ішла размова пра беларускую літаратурную анамастыку, яе дасягненні, праблемы і перспектывы. Гэты напрамак сучаснага мовазнаўства асабліва актыўна пачаў развівацца ў апошнія 10 гадоў, пра што сведчыць значная колькасць публікацый (даклад В. В. Шура).

Мала распрацаваным да апошняга часу з'яўляецца такі напрамак беларускай літаратурнай анамастыкі, як лексікаграфія: першым і самым значным набыткам лінгвістаў з'яўляецца «Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа» (Мн. , 1990), створаны ён на аснове дванаццацітомнага збору твораў класіка і ўключае каля 6000 артыкулаў. Усе разнавіднасці онімаў у слоўніку аналізуецца з улікам іх мастацка-эстэтычнай і стылёвай функцый. Другая значная праца, дзе змешчаны ўсе разнавіднасці онімаў з твораў Янкі Купалы, – шосты том «Слоўніка мовы Янкі Купалы» . У яго артыкулах тлумачэнне антрапонімаў, усіх разнавіднасцей тапонімаў, вызначаецца іх семантычны патэнцыял, падаюцца ілюстрацыі, раскрываюцца кантэкстуальныя функцыі онімаў. Трэці том «Слоўніка мовы Скарыны» (Мн. , 1994) прысвечаны лексікаграфічнаму апісанню тапанімічнага і антрапанімічнага матэрыялу, выяўленага ў самых розных творах Ф. Скарыны, да онімаў падаюцца разнастайныя гістарычныя звесткі і інш. Мове класіка беларускай літаратуры, яго анамастыкону прысвечана праца Ю. Гурскай «Словарь имён собственных в поэзии М. Богдановича» (Мн. , 1997), у ім тлумачыцца паходжанне 200 імёнаў-персаналій, імёнаў літаратурных герояў і інш. , што выразна характарызуюць ідэастыль паэта. Да сказанага ў гэтым плане можна дадаць наступнае: у Мазырскім педуніверсітэце падрыхтаваны і захоўваюцца на кафедры беларускага мовазнаўства электронныя варыянты анамастычных слоўнікаў твораў Андрэя Мрыя і Уладзіміра Верамейчыка.

Онімы ў сваёй сукупнасці ўтвараюць «анамастычную прастору твора", якая ў створаным пісьменнікам мікрасвеце адпавядае агульнаму зместу мастацкага палатна, аўтарскай канцэпцыі, жанру, мастацкаму метаду, часу напісання твора, этнакультурнаму рэгіёну, у межах якога па дынаміцы сюжэту выяўляецца спецыфіка анамастыкону, адзначаюцца іншыя асаблівасці ў называнні асоб і аб'ектаў рэчаіснасці (А. Рогалеў). Онімы ў наш час пачынаюць таксама аналізавацца і разглядацца з пазіцый лінгвакраязнаўства, выдзяляючы ў іх так званы «культуралагічны кампанент» значэння слова, падкрэсліваючы, што ў мастацкім тэксце ім уласціва не толькі намінацыйная, а і кумуляцыйная функцыя, якая знаходзіць сваё прызначэнне і выражэнне ў «нацыянальна-культурным кампаненце значэння оніма". І калі, напрыклад, у тыповых і натуральных для беларускай мовы онімах канатацыйны аспект у звычайным маўленні выступае аслаблена або нейтральна (*Пятро*, *Лукашэвіч*, *Орша*, *Гомель* і г. д.), то сярод назваў «малой радзімы» таго або іншага пісьменніка, апетых у яго творах, найчасцей дамінуюць тыя, якія ўскладнены рэгіянальна-культуралагічнымі канатацыямі, дзе ў большай меры можа выяўляцца гістарычны, этнаграфічны, міфалагічны, фалькларыстычны і іншыя аспекты (*Мікалаеўшчына*, *Альбуць*, *Глінішчы*, *Загор'е*, *Багацькаўка*, *Акопы*, *Ляўкі* і г. д.).

Ізалявана, як вядома, онімы не аналізуюцца, яны – кампаненты ўсёй анамастычнай прасторы. Паэтонімы ў працах даследчыкаў паслядоўна кваліфікуюцца як выразныя тэкстаўтваральныя кампаненты. Пад гэтай функцыяй разумеецца іх магчымасць быць арганізуючым, ключавым і звязным элементам анамастычнай прасторы твора і яго фармальнай арганізацыі. Такія адзінкі, уступаючы ў парадыгматычныя і сінтагматычныя адносіны з іншымі

МГПУ им. И.П.Шамякина

кампанентамі тэксту, замацоўваюць асноватворныя, ключавыя тэкставыя катэгорыі – цэльнасць, звязнасць, завершанасць. Інакш кажучы, пад гэтай функцыяй некаторыя лінгвісты разумеюць «здольнасць анамастычных адзінак быць звязным, канструктыўным элементам зместава-сэнсавай прасторы і фармальнай арганізацыі тэксту» (І. Б. Воранава). Прадаўжаючы і развіваючы гэта ключавое паняцце, відаць, патрэбна гаварыць аб важнейшай кампазіцыйнай і архітэктанічнай ролі онімаў, удзелу іх у рэалізацыі тэкставых катэгорый кагезіі і іншых тэкстаўтваральных элементаў, такіх як цэльнасць, завершанасць і інш.

Асноўныя метады, якія сучаснымі даследчыкамі выкарыстоўваюцца пры аналізе анамастычнай лексікі, у тым ліку і ў творах літаратуры, наступныя: апісальны, выбар якога часцей за ўсё абумоўлены характарам аналізуемага матэрыялу. Яго абавязковымі кампанентамі і этапамі з'яўляюцца паслядоўнае правядзенне інвентарызацыі і самай агульнай класіфікацыі онімаў на падставе іх семантычных, словаўтваральных, функцыянальных і іншых асаблівасцей. З улікам канкрэтных мэт і задач даследаванняў у апошнія гады пры вывучэнні самых розных аспектаў літаратурных онімаў комплексна выкарыстоўваюцца: параўнальна-гістарычны, дэскрыптыўны метады, а таксама, хоць і ў меншай ступені, этымалагічны, структурны, словаўтваральны аналізы самых розных паэтонімаў. Пры вызначэнні сэнсавага аб'ёму ключавых онімаў, іх культуралагічнага напаўнення далучаюцца метады кампанентнага аналізу, семантычнай рэканструкцыі і прафіліравання канцэптаў. У некаторых працах, напрыклад, прысвечаных вывучэнню функцыянавання традыцыйных прозвішчаў, айконімаў, значная роля адводзіцца арэальнаму метаду з выкарыстаннем сучасных дасягненняў гісторыяграфіі і камп'ютарнай лінгвагеаграфіі (гл. напрыклад, працы Ю. Гурскай, А. Рогалева, І. Петрачковай, Г. Дзеравяга і інш.)

Комплекснае апісанне тапонімаў і антрапонімаў дыктуецца асаблівасцямі гэтых адзінак не толькі як важнейшых тэкстаўтваральных, стылёваўтваральных, канцэптуальных адзінак, а таксама ўласцівасцямі онімаў мяняць і ўскладняць іх тэкставую семантыку за кошт агульнатэкставых і самых розных аўтарскіх прырашчэнняў, утвараючы ў сукупнасці пэўную сістэму з характэрнымі толькі для яе спецыфічнымі рысамі і заканамернасцямі функцыянавання. Такі падыход і сістэмны аналіз анамастычнай прасторы мастацкіх твораў, што распачаты беларускімі навукоўцамі, карэлюе з даследаваннямі онімаў, якія праводзяцца ў наш час у Расіі, Украіне, Польшчы і інш. Параўнайце ў гэтым плане шырокамаштабныя даследаванні, якія ажыццяўляюцца пад кіраўніцтвам такіх вядомых вучоных, як А. Супяранская (Масква), Я. Оцін, В. Калінкін (Данецк), Ю. Карпенка (Адэса), Г. Кавалёў (Варонеж), У. Супрун (Валгаград), В. Фанякова (Санкт-Пецярбург), А. Мацвееў, Е. Беразовіч (Екацярынбург), С. Талстая (Масква), Е. Бартмінскі (Польшча) і інш. Развіццё тэорыі літаратурнай анамастыкі, прадстаўнікамі гэтых навуковых школ, якія актыўна ўлічваюць эвалюцыйныя этапы і змены фарміравання і функцыянавання мовы ў цэлым, а таксама яе сувязі з мысленнем чалавека, змяніла погляды на некаторыя моўныя факты і працэсы і дазволіла ўнесці істотныя карэктывы ў тэорыю вывучэння ўласных імёнаў, асабліва тых, што выкарыстоўваюцца ў творах мастацкай літаратуры. Такім чынам, літаратурная анамастыка разглядаецца як асобны перспектыўны напрамак лінгвістыкі, як сфера ўзаемадзеяння мовазнаўства і літаратуразнаўства ў аспекце сувязей з іншымі роднаснымі навуковымі дысцыплінамі.

Значны фактычны і тэарэтычны беларускі анамастычны матэрыял, які пачынае ўпершыню комплексна ўводзіцца ў кантэкст фармавання і апісання анамастычнай прасторы беларускіх мастацкіх твораў, дазволіць у бліжэйшай перспектыве не толькі паглыблена з улікам сучаснай навукі вывучаць і апісваць анамастычную сістэму асобных твораў на шырокім лінгвістычным і культуралагічным фоне, а і дапоўніць новымі фактамі тэорыю функцыянавання іх анамастычнай прасторы, па-новаму падаць перыядызацыю, класіфікацыю некаторых разнавіднасцей онімаў, а таксама ўдакладніць і дапоўніць вывады папярэдніх даследчыкаў адносна вывучэння літаратурнага анамастыкону з пазіцыі сучаснай навуковай парадыгмы.

У асобны напрамак анамастыкі выдзелілася беларуская анамастычная лексікаграфія. Як адзначана спецыялістамі, у беларускім мовазнаўстве склалася алагічная сітуацыя, адметнасць якой у тым, што амаль пры поўнай адсутнасці канцэптуальных работ абагульненага характару колькасць разнастайных аспектных публікацый па праблемах гісторыі і тэорыі лексікаграфіі вымяраецца сотнямі. С. Шахоўскай апублікавана абагульняльнае манаграфічнае даследаванне «Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця» (Мн. , 2012 – 258 с.), у якім яна ўпершыню ў айчынным мовазнаўстве правяла комплекснае апісанне беларускіх антрапанімічных і тапанімічных слоўнікаў. У манаграфіі акрэслены межы і спецыфічныя рысы асноўных перыядаў у развіцці анамастычнай лексікаграфіі, апісана структура слоўнікаў, распрацавана іх разгалінаваная тыпалогія.

Мы мяркуем, што ў бліжэйшай перспектыве павінны з'явіцца комплексныя працы з паглыбленым аналізам анамастычнай прасторы мастацкіх твораў беларускай літаратуры ў асобных яе жанрах – паэзіі, прозе, драматургіі, сатырычных і парадыйных творах. З улікам накопленага тэарэтычнага матэрыялу могуць, на наш погляд, разглядацца самыя розныя асаблівасці онімаў-сімвалаў, алюзійных і прэцэдэнтных онімаў, прадоўжыцца далейшае тэарэтычнае апісанне анамастычных палёў мастацкіх твораў, функцыі тэкставай вяхі антрапонімаў, семантыкі паэтонімаў, якія функцыянуюць на аснове прыёмаў трансанімізацыі, загаловачнага комплексу, прадоўжыцца вывучэнне прагназуючых функцый загалоўкаў мастацкіх тэкстаў, ядзерных анамастычных палёў і фонавых анамастычных намінацый і інш. У галіне беларускай лексікаграфіі перспектыўнымі і запатрабаванымі не толькі для вырашэння праблем анамастыкі нам уяўляюцца разнастайныя анамастычныя слоўнікі твораў асобных пісьменнікаў, асацыятыўныя анамастычныя слоўнікі, слоўнікі канатонімаў, слоўнікі анамастычнай тэрміналогіі і іншыя лексікаграфічныя працы. Аналагічныя даследаванні ў галіне літаратурнай анамастыкі ў названых накірунках, як мы ўжо адзначалі, у беларускім мовазнаўстве да гэтага часу не праводзіліся або толькі пачынаюць праводзіцца.

МГПУ им. И.П. Шамякина

**Літаратура**

1. Шур, В. В. Беларуская літаратурная анамастыка: яе дасягненні, праблемы і перспектывы / В. В. Шур // Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 20 красавіка 2010 г.); Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2010. – 314 с.

2. Рогалев, А. Ф. Имя и образ: Художественная функция имён собственных в литературных произведениях и сказках / А.Ф. Роголев. – Гомель: Барк, 2007. – 224 с.

3. Ляшчынская, В. Слова ў паэзіі Янкі Купалы / В. Ляшчынская. – Мінск: Бел. навука, 2004. − 272 с.

4. Рагаўцоў, В. І. Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў, 2002. − 304 с.

5. Ратникова, И. Э. Имя собственное: от культурной семантики к языковой / И. Э. Ратникова. – Минск: БГУ, 2003. – 214 с.

6. Гируцкий, А. А. Белорусско-русский художественный билингвизм: типология и история, языковые процессы / А.А. Гируцкий. – Минск, Университетское, 1990. – 175 с.; Гируцкий, А. А. Тайна имени / А. А. Гируцкий. – Минск: Тэхналогія, 1996. – 128 с.

7. Мезенка, Г. М. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г. М. Мезенка [і інш. ]. – Віцебск: УА «ВДУ імя П.М. Машэрава", 2009. – 254 с. ; Мезенка, Г. М. Беларуская анамастыка: навучальны дапаможнік для студэнтаў універсітэтаў / Г.М. Мезенка – Мінск.: Вышэйшая школа, 1997. – 119 с.

8. Гурская, Ю. А. Древние фамилиии современного белорусского ареала на славянском и балтийском фоне / Ю. А. Гурская – Минск: Бел. гос. пед. университет, 2007. – 360 с.

9. Шур, В. Беларускія ўласныя імёны: Беларуская антрапаніміка і тапаніміка: дапам. для настаўнікаў / В. В. Шур – Мінск: Маст. літ. , 1998. – 239 с. ; Шур, В. Анамастычная лексіка ў беларускай мастацкай літаратуры: манаграфія / В. В. Шур. – Мінск: УП «Тэхнапрынт", 2002. – 226 с. ; Шур, В. Онім у мастацкім тэксце: Манаграфія / В. В. Шур. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2006. – 216 с. ; Шур, В. Уласныя імёны ў часе і прасторы / В. В. Шур. – Мінск: НІА, 2008 – 100 с. ; Шур, В. Уласнае імя ў мастацкім тэксце / В. Шур. – 2010 – 207с .

МГПУ им. И.П.Шамякина